*Міхась Болсун*



## Покліч бацькоўскай зямлі

*Радзінны кут не выбіраюць.*
*Дзе свет убачыць немаўля,*
*Там стане блізкаю зямля,*
*Бліжэй, мілей, чым шаты раю.*

## ВЫТОК

*Абсягі Чачэрскага краю*
*Прапісаны ў сэрцы маім.*
*Бы птушка, сюды прылятаю*
*Ці холад, ці спёка стаіць.*

*Завуць Балсуны і Палессе* —*
*Жыццёвай дарогі выток,*
*Люляла тут сны мае песня —*
*Пяшчоты душэўнай глыток.*

*...Сцяжынка знаёмая ўецца.*
*Трава зноў у пацерках рос.*
*Нястрымана просіцца сэрца*
*У цішу зарэчных бяроз.*

*Сустрэне грыбамі Лысуха***
*Сухі-вось дык назва! —Ручэй**.*
*Мелодыі лесу паслухай —*
*Самоту прагоніш хутчэй.*

*З прасекі на ягаднік збочу —*
*Сасонка ігліцай кране.*
*Чарніц цёмна-сінія вочы*
*Спакусна зірнуць на мяне.*

*Дзяцінства ўспомніцца раптам,—*
*Не вернеш вясёлай пары,—*
*Лес клікаў нас ліпеньскім ранкам:*
*Гарлачык для ягад бяры.*

*Чародкай сяброўскай хадзілі,*
*Дужэла моц нашае крыл.*
*І разам з малою Радзімай*
*Вялікую тут я адкрыў.*

## ЧАЧЭРСК

*Добры дзень, поле з коласам*
*жытнім,*
*Мяккі водар бухматых садоў,*
*Мой зялёны такі, старажытны*
*На далонях зямлі гарадок!*

---

* Балсуны, Палессе — вёскі.
** Лысуха, Сухі Ручэй — назвы ўрочышчаў.

*Фарбай светлай абноўленых*
*вуліц*
*Зззяе, вабіць Чачэрск-прыгажун.*
*Парк гасцінна мяне зноўку*
*туліць,*
*На Чачору ўлюблёна гляджу.*
*Позірк ловіць лугі, азярыны.*
*Сіняй стужкай віднеецца плёс.*
*Праплываюць аблокаў пярыны*
*У блакіце высокім нябёс.*
*Хваляй Сожа бягуць успаміны.*
*Зноў гукаю сваю маладосць.*
*Дзякуй, родны Чачэрск,*
*сэрцу мілы,*
*За гасціннасць тваю, прыгажосць.*

## РОДНЫЯ НАЗВЫ

*Ці вёска гэта, ці рачулка —*
*Іх назвы музыкай гучаць,*
*Кранае слоўца нас прачула,*
*Бы спеў салоўкі па начах.*

*Палессе, Ніўкі і Залессе,*
*Заручча, Добрынь і Гаёк*,*
*Нібы радкі лірычнай песні,*
*Што чую сэрцам я здалёк.*

*Мне вёскі гэтыя, бы сёстры,*
*Па духу блізкая радня.*
*Праз годы доўгія і вёрсты,*
*Іх лёс у памяці штодня.*

*Бягуць удалеч там жа рэкі,*
*Дзе ў радасць ходзім басанож.*
*Нібы магнітам цягне нейкім*
*Мяне блакітны плыткі Сож.*

*Вясной з гарэзаю Чачорай***
*Абдымуць дружна бліжні луг.*
*Паводка, нібы тое мора,*
*Прывольна плешчацца наўкруг.*

*Віляе вузкім шнурам Покаць**,*
*Траву калышуць берагі,*
*Як май на іх рассыпле лотаць —*
*Халодны цень сплыве тугі.*

*Каўпіта** — значыць, белы жораў, —*
*У Бесядзь ціхую цячэ.*
*У вір ныраюць смела зоры,*
*Калі гусцее туш начэй.*

* Палессе ... Гаёк — назвы вёсак на Чачэршчыне.
** Чачора, Покаць, Каўпіта – назвы рэк там жа.





*Наш продак быў, відаць, паэтам,*
*І спраў, і слоў красу цаніў.*
*І нам любіць бы край весь гэтак,*
*Быць каласком на ўлонні ніў!*

## МОЙ КРАЙ

*Чачэрскі край — абсцяг пад сонцам,*
*Радзіма продкаў і мая,*
*Дзе самародкам льецца слоўца*
*І знак вякоў нясе зямля.*

*Чачэрскі край — старонка гэта*
*Пакрыта славай ваяроў*
*І працай рупнаю сагрэта,*
*Дзе ніў размах і шум бароў.*

*Чачэрскі край бярозак белых,*
*Блакітных сподкаў азярын,*
*І рэк, што ў далячынь пабеглі,*
*І барваў ранішняй зары.*

*Перад травінкай, краскай кожнай*
*Гатоў упасці ўдзячна ніц.*
*Адлётны крык гусей над пожняй*
*Ва мне тужлівасцю шчыміць.*

*Чачэрскі край! Тут «мірны» атам*
*Сарваўся з неба на бяду.*
*Людзьмі пакінутыя хаты*
*Ўраслі па вокны ў лебяду.*

*Ды не скарыўся край нязгодзе.*
*Багацце шчырае душы*
*Жыве стагоддзямі ў народзе,*
*Як і гасціннасць — без мяжы.*

## ХЛЕБ

*Чорны хлеб — гэта золата*
*злітак,*
*Ды і яно яму не роўня.*
*Успамінаю: барануем жыта,*
*Падганяю старога каня.*
*А на полі — адны жанчыны*
*І чародка маіх сяброў.*
*Тры гады не аралі мужчыны,*
*Іх забрала вайна з двароў.*
*Тут нялёгка. І тут — край*
*пярэдні,*
*Не сціхае бой за жыццё.*
*Падкамкаўшы зрэбны пярэднік,*
*На мяжы корміць маці дзіцё.*
*Зашугае ж калоссем жыта,*

*Як шугае зара сама...*
*Чорны хлеб — працы цяжкае*
*злітак, —*
*Я з маленства цаню яго смак.*

## ДАРОГА Ў ВЁСКУ

*Прачнуўся ранак*
*Летні над ракой,*
*Прылёг на беразе*
*Пагрэцца...*
*Вядзе дарога*
*Зноў да землякоў,*
*Якім вязу пачуцці сэрца.*

*Мільгаюць сосны*
*І гурты бяроз,*
*Багун*
*І ландышаў суквецці.*
*А думкі там даўно,*
*Дзе коліс рос,*
*Дзе хата бацькі*
*Сціпла свеціць.*

*Ля студні бразне*
*Вёсачка вядром,*
*Жаўрук пракаліць*
*Паднябессе,*
*Гасціннасцю сустрэне*
*Кожны дом:*
*— Заходзь, сынок,*
*Тваё ж Палессе.*

## УСПОМНЮ ПАЛЕССЕ СВАЁ

*Уладзіміру Ядранцаву*

*І стужкай блакітнай Каўпіта*
*За вёскаю роднай імчыць.*
*Пад ветрам калышыцца жыта*
*І бронзай на сонцы блішчыць.*
*Тут ліпы пахучыя лісцем*
*Просяць пад засень густы,*
*Маё тут блукала дзяцінства —*
*Дзе бесклапотнасць дзён тых?*
*Праходзяць гады чарадою,*
*Мінула юнацтва маё.*
*Сустрэнуся з шчасцем, бядою —*
*Успомню Палессе сваё,*
*Дзе вечарам веснім дзяўчаты*
*Марацъ аб любых сваіх,*
*Гармонік сумуе ля хаты,*





*Да ранку пяюць салаўі,*
*Дзе песень ляцяць пагалоскі*
*З вуліц вячэрніх у гай...*
*Дзень добры, зарэчная вёска,*
*У будні і святы прымай!*

## МАЯ РАКА

*Я многія бачыў рэкі,*
*Мая ж рака — не з такіх,*
*Бо коціць на хвалях рэха*
*Трывожнае — маці ласіх.*

*На лузе дзяркач не змаўкае,*
*Крычыць:*
*— Годзе спаць,*
*— Годзе спаць.*
*Туман на ўзбярэжжу блукае,*
*Начлегу не змог адшукаць...*

*Як неба ўспыхне на ўсходзе*
*І сонейка ў вір упадзе,*
*На бераг памыцца прыходзіць*
*Па травах няскошаных дзень.*

## СНЫ

*Спіць вёска мая Балсуны*
*Пад коўдрай, вытканай з зорак.*
*Пра што, землякі, вашы сны,*
*Радасць людскую ці гора?*

*Месяц-ліхтар вісне ўгары,*
*Ноч баль навокал свой правіць.*
*У снах можна ўсё паўтарыць*
*І нават нешта паправіць.*

*Няхай жа часцей хоць у снах*
*Смяюцца радасна людзі,*
*Цвіце ў іхніх душах вясна*
*Пакуль зара не разбудзіць.*

* * *

*Старэе вёска. Смех дзіцяці*
*Усё тут чуецца радзей.*
*Пенсіянер — у кожнай хаце,*
*Жыццё самотнае ідзе.*

*Гармонік дзе і бубен гулкі,*
*І танцы, песні да світання,*
*Шэпт закаханых у завулках,*
*І певень, што будзіў пад ранне?*

*Забіты хаты. Крыж з шалёўкі,*
*Нібы маўклівы нам дакор.*

*О, час, нястрыманы, шалёны!*
*Губляем спадчыну вякоў.*

*Хто падганяе, адсюль турыць,*
*Куды спяшаем, мяжа дзе,*
*Калі плач вёсачкі хаўтурны*
*Часцей чуваць, чым плач дзяцей?!*

## ЧАЧОРА

*Над Чачорай зніклі зоркі,*
*Сплыў кудысьці маладзік.*
*Чуцен шоргат ціхі лодкі,*
*Звонкі голас маладзіц.*

*Асака вадой спавіта,*
*Зелянеюць берагі.*
*Сонцам шчодра луг заліты,*
*Дрэмлюць пульхныя стагі.*

*У чароце птах спявае,*
*Ухваляе лёс ракі.*
*Вецтем парк з гары ківае,*
*Хваля гойдае блакіт.*

*А Чачора, як учора,*
*Сожу сілы аддае*
*І Дняпру. Ажно да мора*
*Пабяжыць вада яе.*

## УСПАМІН ПРА ЧЫРВОНЫ БЕРАГ *

*Гудуць натужна лесавозы,*
*Паўзуць па снезе, па гразі,*
*Калі дажджамі плача восень,*
*Калі ўладарыць холад зім.*

*Тут краны хобатам сталёвым*
*Кладуць бярвенні ў штабялі,*
*І пах густы лясоў хваёвых*
*Парфумай льецца па зямлі.*

*Дзядзькі сямейныя і хлопцы*
*Жывуць брыгадай, заадно,*
*Калі харчуюцца ў сталоўцы —*
*Масніцы ходзяць хадуном.*

*Ад жартаў вострых, вострых кпінаў-*
*На іх ахвочы, здатны люд,—*
*Як слоўца раптам нехта кіне,*
*Пачуеш мудрасць, мовы цуд.*

*Дарма, што ў робах мурзаватых*
*І копаць на руках ляжыць.*

* Чырвоны Бераг — рабочы пасёлак на р.Сож каля Чачэрска





*За словам звонкім, зухаватым*
*Багацце бачыцца душы.*

*Вясной, калі наўсцяж паводка,*
*Людзей зарэчных па чарзе,*
*Бы зайцаў дзед Мазай, на лодках*
*Тут кожны з гонарам вязе.*

*Усім так хочацца дахаты*
*Купіць духмяныя хлябы*
*І з'есці мякіш наздраваты,*
*Тады лічы, што тут пабыў.*

*І так гадамі ў будні, святы*
*На ўскрайку лесу, ля ракі*
*Шчыруюць землякі заўзята —*
*Шафёры, цеслі, леснікі.*

## ВОЗЕРА КОЎПІН

*Коўпін * кракнуў качкай дзікай,*
*Плёхнуў гулка шчупаком.*
*Побач лес сініцай ціўкаў,*
*Туман ліўся малаком.*
*Вецер гнаў яго імкліва,*
*Спатыкаўся на бягу*
*Аб траву і купін грывы,*
*Аб лазняк на берагу.*
*На ваду прылёг, прыціхнуў,*
*Пад якой — двайное дно.*
*Глыбіню да тайнаў іхніх*
*Людзі мералі даўно.*
*Зналі першае, дзе мелка,*
*А пад ім — шчэ вір вады,*
*Не хапала нават меркі*
*Углыб вымераць хады.*
*Навакол жа лес і жыта,*
*Чарада плыве падзей...*
*Коўпін-возера, скажы ты,*
*Дзе твая разгадка, дзе?*

## ПАРК НА ЗАМКАВАЙ

*Парк на ўзвышшы — зялёная сцэна,—*
*Хор птушыны спявае заўжды,*
*Дрэвы вецем, нібыта антэнай,*
*Ловяць лета мажорны матыў.*

*Голас з ранку сініцы спрабуюць,*
*Шпак спрасоння наўдзіў засвістаў.*
*Гэты спеў успаміны зноў будзіць,*
*Дні пражытыя я прагартаў,*

* Коўпін — возера каля Чачэрска

*Бы пабыў на пляцоўцы з аркестрам,*
*Дзе з дзяўчынай тады танцаваў,*
*А калі станавілася цесна,*
*Вечар нас пад шацёр ліп хаваў.*

*Вабіў бераг нас цёплы Чачоры,*
*Дзе кудзеляй гусціўся туман...*
*Толькі час, нібы след метэора,*
*Спапяліў наш нясмелы раман.*

***

*Уладзіміру Пернікаву*

*Круг, Асухі і Равуха* —*
*Мясцін сонечных абшар.*
*Ловіць спевы птушак вуха,*
*Дзе прастор для светлых мар,*
*Дзе рыбалка — захапленне,*
*Думкі возьмуць у палон*
*Знічак зыркія імгненні,*
*Траў прыветлівых паклон.*
*Нізку плотак я з Асухаў,*
*Нібы дар, нясу дамоў.*
*Рад, што мову зямлі слухаў,*
*Я не знаю лепшых моў.*

## ПАРОМ

*Натужна рыпіць, бы калёсы,*
*Гойдае ў хвалях цень.*
*Сонечны промень на тросе*
*Катаецца кожны дзень.*

*Лябёдка вурчыць, стракоча,*
*На лёс наракае свой —*
*Змена ад ранку да ночы,*
*Рэдка ля рэчкі спакой.*

*Хапае Сожу работы —*
*Ажно выгінае спіну,*
*Стараецца, хоць і нялёгка,*
*Нагрузку такую цягнуць.*

*Чакаюць зарэчныя сёлы*
*Вугаль, цэмент, муку...*
*Адна без парома вясёлка*
*Пераступае раку.*

* * *

*Чым больш жыву,*
*тым больш люблю*

* Круг, Асухі і Равуха — урочышчы ў пойме Сожа і Чачоры каля Чачэрска





*цябе, мой край*
*чачэрскі,*
*з дзяцінства родную*
*зямлю,*
*людзей,*
*душой не чэрствых.*

*Маленства даўнія*
*сады*
*і сцежкі маладосці*
*жывуць у памяці*
*заўжды,*
*яны — святое штосьці.*

*Шугаюць*
*квецению сады,*
*бяжыць шнурком*
*Каўпіта,*
*І ў кожны мой*
*прыезд сюды,*
*бы кніга,*
*край раскрыты.*

* * *

*Над Чачэрскам развеяўся золак,*
*Над ім звонкая, крохкая ціш.*
*Атухаюць агеньчыкі зорак.*
*Залаціцца царквы ярка крыж.*

*А бадзяга-туман зноў мярэжай*
*Лёг сушыцца на вецце кустоў.*
*Парк на Замкавай, ратушы вежы*
*Ранак барвай фарбуе густой.*

*З дрэў сцякаюць нячутна расінкі.*
*Лазняк сонна глядзіць у раку.*
*А з усходу, з суседняй Расіі*
*Паказала ўжо сонца шчаку.*

*Гэты міг да жыцця любоў будзіць,*
*Сум дрымотны я з сэрца ганю.*
*П'ю жадобна, на поўныя грудзі,*
*Горад родны, тваю цішыню.*

## РАТУША

*Ля ціхай Замкавай гары*
*Ляжыць квадрат цэнтральнай плошчы,*
*Жаўцеюць ратушы муры,*
*Пячэ іх спёка, ліўні хвошчаць.*

*Таўшчэзнай кладкі камяні*
*Хаваюць даўнія сакрэты,*
*Калі б умелі гаманіць*
*Зашмат бы расказалі свету,*

*Як жыў, тварыў вякі Чачэрск,*
*Названы іменем Чачоры,*
*Якая стужкаю цячэ*
*У Сож, а з ім — далей, да мора.*

*...Паўсюль гісторыі сляды,*
*Яе блукае глуха рэха.*
*Цары трымалі курс сюды,*
*І Пушкін некалі тут ехаў.*

*Глядзіцца ратуша ў блакіт —*
*Славуты нашых продкаў помнік.*
*Адсюль ляцяць ва ўсе бакі*
*Шырокіх, светлых вуліц промні.*

## ДЗЕДАВА ХАТА

*Да кладкі знаёмай*
*Лячу — не іду я,*
*Там лозы глядзяцца*
*Ў люстэрка ракі.*
*Ля дзедавай хаты*
*Вяз ціху вартуе,*
*Высока узняўшы*
*Над дахам сукі.*
*Ігруша старая*
*Мне веццем махае.*
*Сцішэлая лазня*
*Стаіць на мяжы.*
*Хлапчук незнаёмы*
*«Днём добрым» вітае.*
*Шчымлівасць пачуццяў*
*На сэрцы ляжыць.*

*Вяртае зноў памяць*
*У даўнія зімы,*
*У цёплае лета,*
*На росны той луг,*
*Дзе пасвіў гусей я,*
*Чакаў дзеда Кліма,*
*Ён ведаў: галодны*
*Унучак-пастух.*

*Праснак умінаў я —*
*Аж трэск за вушамі.*
*Настрой узнімаўся,*
*Ясніўся пагляд,*
*І дзед для прылíку*
*Бяззуба мне шамкаў,*
*Сабраўшы ў дзяружку*
*Сухога галля:*





*— Унучак, прыходзь-ка,*
*Ўжо вішні паспелі,*
*Сарокі — зладзейкі*
*Бязбожна клююць.*
*...Гайдаўся на голлі*
*Я, бы на арэлях.*
*Вішняк той успомню —*
*І слінкі цякуць.*

*Малюнкі маленства*
*У сны мне прыходзяць,*
*Хоць часу не спыніш*
*Імклівай хады.*
*Сягоння маркотна*
*На тым агародзе:*
*Зямелька дзічэе,*
*Старэюць сады.*

## КУКЛІЧЫ

*Сувалаву В. П.*

*Кучаравы сасняк*
*Каля Кукліч не спіць:*
*Птушак слухае спеў,*
*Пошум ветру на ўзгорку...*
*Перапёлкі ў жытах*
*Просяць вечнае: «Піць».*
*Ноч ссыпае з нябёс*
*На плёс Покаці зоркі.*

*У зялёным кутку,*
*Каля стыку дарог*
*Крыж трымае ручнік,*
*Ключ гамоніць крыніцы,--*
*Час у душах людзей*
*Вернасць Богу збярог,*
*Тут яму і зямлі*
*Кожны можа маліцца.*

*Пяты век вёска свой*
*Крыж жыццёвы нясе.*
*Шчасце песняй было,*
*Войны — чорнай навалай.*
*Сіла ж мужных людзей*
*Беды сцерла усе,*

*Бо Тарасенка — кум,*
*А сват лепшы — Сувалаў.*

*Уся вёска — радня,*
*Карані ў іх адны.*
*Хіба мала такіх*

*Параскідана ў свеце?*
*... Лес грыбамі прапах*
*І жывіцай сасны.*
*Бы далёкі маяк,*
*Вокны вёсачкі свецяць,*
*Каб з дарог да яе*
*Не збіваліся дзеці...*

* * *

*Дабрыня, дабрыня —*
*Ветразь шчырай душы,*
*Пачуцця вышыня,*
*Компас верны, як жыць.*

*Крок звяраю па ёй,*
*Не згублю цеплыні,*
*Бо ў дарозе сваёй*
*Кошт пазнаў дабрыні.*

## НАРОДНАЯ ПЕСНЯ

*Чыста, напеўна, шчымліва*
*Голас жаночы звініць.*
*Чую, здаецца, шэпт нівы,*
*Гоман палескіх крыніц.*

*Бачу вяселлі, калядкі,*
*Тройцу, гуканне вясны,*
*Сноп на дажынках і святкі,*
*Людны абрад баразны.*

*Мудрасць пяшчотнага слова.*
*Шчыры, душэўны матыў.*
*І ані кропелькі злога, —*
*Шчодры прамень дабраты.*

*Буры вякоў не скасілі*
*Дум залаціначкі ўсе.*
*Колькі жыццёвае сілы*
*Песня такая нясе!*

*Голас вадзіцы крынічнай*
*Дорыць зямелькі ключы.*
*Песні народнай лірычнай*
*Нам бы жыццё зберагчы!*

## РАЁНКА

*Невялікі фармат,*
*Ды прыхільнікаў шмат*
*У раённай заўсёды газеты.*
*У дарозе штодзень*
*Непаседлівы штат,*





*Дорыць людзям радкі,*
*Што душою сагрэты.*

## ЖНІВО

*Вісіць над нівай хлебнай спёка.*
*Жніво камбайнамі гудзе.*
*Бацян, прысеўшы недалёка,*
*Іржэўнік мерае штодзень.*

*Трымціць паветра ціхай хваляй.*
*На неба глянь - шкляная сінь.*
*Шчыруе бацька за штурвалам,*
*А побач з ім шчыруе сын.*

*У бункер зерне б'е, струменіць,*
*Нібыта крышыцца бурштын,*
*У ім — энергія праменняў*
*І цеплыня дажджоў густых.*

*Запахла поле караваем,*
*Такім жаданым на стале.*
*І гэты пах над родным краем*
*Разносіць бусел на крыле.*

